УДК 94(476.5):[502.1:630]"1846/1866"

# ДЗЕЙНАСЦЬ ВІЦЕБСКАЙ ПАЛАТЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ МАЁМАСЦЕЙ ПА АХОВЕ ЛЯСОЎ (1840–1866 гг.)

**І. В. Пугач,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 01.10.18.

UDC 94(476.5):[502.1:630]"1846/1866"

# ACTIVITIES OF THE VITEBSK CHAMBER OF STATE PROPERTY IN THE FOREST PROTECTION SPHERE (1840–1866)

**I. Pugach,**
*Postgraduate Student of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, BSPU*

Received on 01.10.18.

Артыкул прысвечаны праблеме дзейнасці Віцебскай палаты дзяржаўных маёмасцей па ахове лясоў у перыяд з 1840 па 1866 г. Адлюстраваны працэс развіцця арганізацыйнай структуры і паказаны функцыянальныя абавязкі мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі. Робіцца высновa аб паспяховасці захадаў Міністэрства дзяржаўных маёмасцей па размеркаванні лясных плошчаў у зручныя для нагляду тэрыторыі, рэгламентацыі мясцовай лесаахоўнай дзейнасці і ажыццяўленні кадравай палітыкі ў Віцебскай губерні.

*Ключавыя словы:* Віцебская губерня, палата дзяржаўных маёмасцей, ахова лясоў, лясныя чыноўнікі, лясная варта.

The article is devoted to the problem of the activities of the Vitebsk Chamber of State Property for the protection of forests from 1840 to 1866. The process of development of the organizational structure is reflected and the functionality of the local forest protection administration is shown. On the basis of the data obtained, it is concluded that the measures of the Ministry of State Property have been successful in organizing forest areas in convenient areas for supervision, in regulating local forest protection activities and in implementing the personnel policy in the Vitebsk province.

*Keywords:* Vitebsk province, Chamber of State Property, forest protection, forest officials, forest guard.

Ахове лясоў у Расійскай імперыі надавалася пільная ўвага, дзякуючы значнай ролі лясной гаспадаркі ў гаспадарчай сістэме дзяржавы. У адзначаны перыяд урад быў зацікаўлены ў захаванні цэласнага стану дзяржаўных лясоў, што з'явілася стымулам да развіцця спецыяльнага апарату дзяржаўных органаў кіравання з мэтай іх аховы. У 1837 г. было ўтворана Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Нагляд за лясамі Віцебскай губерні быў ускладзены на II Дэпартамент дзяржаўных маёмасцей, а з 18 студзеня 1843 г. – на аднаўлены Лясны дэпартамент. Важную ролю ў ахове лясоў адыгрываў Корпус ляснічых, які быў утвораны 30 студзеня 1839 г. Разам з тым, новае міністэрства мела патрэбу ва ўласных мясцовых органах кіравання для ажыццяўлення аховы лясоў [1–3].

30 красавіка 1838 г. было прынята рашэнне аб утварэнні губернскіх палат дзяржаўных маёмасцей. Ахова лясоў ускладалася на лясныя аддзяленні палат. Да іх ведамства адносіўся нагляд за казёнымі адзінага ўладання, сялянскімі, спрэчнымі паміж казной і прыватнымі асобамі ці іншымі ўстановамі лясамі, а таксама за падатковымі ляснымі ўчасткамі і лясамі, прыпісанымі да розных ведамстваў, але не выключанымі з юрысдыкцыі лясной адміністрацыі [4].

У Віцебскай губерні палата дзяржаўных маёмасцей пачала дзейнасць амаль праз два гады пасля выдання распараджэння аб утварэнні палат па ўсёй імперыі, што было звязана з прыняццем спраў ад казённай палаты [5, арк. 122]. Гэтай праблемай займалася Віцебская падрыхтоўчая камісія, якая была ўтворана 3 ліпеня 1839 г. [5, арк. 18]. 28 снежня 1839 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці з 1 сакавіка 1840 г. Віцебскай палаты дзяржаўных маёмасцей. Лясное аддзяленне палаты падзялялася на тры сталы. Першы, распарадчы, стол вёў справы па апісанні, межаванні, ахове лясоў і карыстанні імі, вылучэнні лясных участкаў для манастыроў, сельскіх абшчын, дзяржаўных сялян,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

водпуску лесу на будаўніцтва і рамонт, а таксама па ўліку асабістага складу. Другі, следчы, стол разбіраў справы, звязаныя з парушэннем ляснога заканадаўства ці са спрэчнымі лясамі. Трэці, бухгалтарскі, стол быў адказны за фінансавую справаздачнасць па лясной частцы. Лясное аддзяленне ўзначальваў губернскі ляснічы. Ён сачыў за выкананнем ляснога заканадаўства, дзейнасцю лясных чыноў і лясной варты, планаваў лесагаспадарчыя і лесаахоўныя мерапрыемствы. У дапамогу губернскаму прызначаўся вучоны ляснічы, які замяшчаў яго ў выпадку адсутнасці [4]. Трэба адзначыць, што вучоны ляснічы не паказаны ў справаздачы за 1848 г. сярод лясных чыноўнікаў, якія служылі пры Віцебскай палаце дзяржаўных маёмасцей, а ў справаздачы за 1858 г. адзначана, што адпаведная пасада была скасавана [6, арк. 78-78 адв.; 7, арк. 54]. Акруговыя ляснічыя павінны былі займацца адпаведным справаводствам, выдачай гербавых білетаў на высечку лесу ў казённых дачах і рэалізацыяй лесаматэрыялаў, праверкай стану дач, іх гаспадарчым апісаннем, кантролем за расчысткай прасек і ўстаноўкай межавых знакаў, а таксама ўдзельнічаць у разборы спраў па незаконных захопах і вынішчэннях падведамасных лясоў [8, арк. 437-443]. Ляснічыя і падляснічыя практычна выконвалі тыя ж функцыі па кантролі правільнага вядзення лясной гаспадаркі і папярэджанні парушэнняў ляснога заканадаўства, што і акруговыя ляснічыя, але на ўзроўні даручаных ім лясніцтваў і лясных участкаў адпаведна. Па распараджэнні адміністрацыі на падляснічых маглі ўскладацца функцыі па кіраванні лясніцтвамі. На гэтых чыноў ускладаліся абавязкі і па забеспячэнні абмундзіраваннем і жалаваннем сябе і лясных вартаўнікоў. Да таго ж, акруговыя ляснічыя, ляснічыя і падляснічыя каардынавалі дзейнасць лясной варты на сваіх узроўнях [2; 4; 9]. Законам ад 2 красавіка 1845 г. пасада акруговага ляснічага была скасавана. У сувязі з гэтым для ажыццяўлення агляду лясоў і інспекцыі лясной варты было прынята рашэнне прызначыць ва ўсіх губернях акруговых лясных рэвізораў, а ўсе мясцовыя лясныя афіцэры атрымлівалі агульную назву – ляснічыя [10].

Ахова лясоў ад знясілення і вынішчэння патрабавала ад ляснога аддзялення не толькі актыўнай лесаахоўнай дзейнасці, якая заключалася ў наглядзе за нарыхтоўкай лясных матэрыялаў і правільнай яе арганізацыі, ажыццяўленні здымачных і лесаўпарадкавальных работ, арганізацыі правільнай працэдуры здачы і прыёму лясоў і пазбяганні яе правядзення зімой ці ў перыяд значных лясных нарыхтовак. Лясныя чыноўнікі павінны былі складаць ведамасці па ўсіх лясных дачах губерні, супрацоўнічаць з валаснымі галавамі і сельскімі старшынямі з мэтай папярэджвання ці выкрыцця лясных злачынстваў. Акрамя таго, яны прадстаўлялі свае меркаванні наконт дастатковасці ці недастатковасці прынятых лесаахоўных захадаў, разлічвалі прыкладныя выдаткі на ўтрыманне лясной варты, вызначалі за ахову якіх лясоў неабходна выплачваць палясоўшчыкам грашовую ўзнагароду і вырашалі якімі зямельнымі надзеламі неабходна забяспечыць пастаянную лясную варту. У асобнай запісцы тлумачыліся прычыны, якія пабудзілі да магчымых змяненняў у парадку аховы лясоў [11, арк. 40 адв., 192–192 адв., 12, арк. 35-36 адв.; 13, арк. 10–11, 78].

Губерні Расійскай імперыі падзяляліся на разрады згодна з памерамі лясных плошчаў і каштоўнасцю лясоў з мэтай аптымальнага ўпарадкавання ляснога кіравання. Віцебская губерня была аднесена да 4 разраду [2]. У 1840 г. яе лясныя масівы былі падзелены на 3 акругі, а апошнія – на 4 лясніцтвы і 2 лясныя ўчасткі. Для аховы лясоў губерні, акрамя губернскага ляснічага, прызначаліся 3 акруговыя ляснічыя, 1 ляснічы і 5 падляснічых [4; 8, арк. 523, 600, 617; 14, с. 39]. Аднак такі падзел лясоў быў прызнаны некаторымі ляснічымі нязручным. У сувязі з гэтым палатай быў складзены праект новага падзелу лясоў на акругі і лясніцтвы з мэтай ураўноўвання службовай нагрузкі лясных афіцэраў. За ўсімі зменамі і спробамі ўладкавання да 1845 г. лясы Віцебскай губерні, падведамасныя Міністэрству дзяржаўных маёмасцей, набылі арганізацыю, якая без значных змен захавалася да канца існавання губернскай палаты дзяржаўных маёмасцей: яны былі падзелены на 2 акругі і 7 лясніцтваў [5, арк. 62-62 адв.; 8, арк. 617; 16, арк. 28-29]. У сувязі з падзелам лясоў, падведамасных Віцебскай палаце дзяржаўных маёмасцей, на 2 акругі і 7 лясніцтваў змяніўся і склад лясных чыноў. У лясным аддзяленні палаты службу неслі 1 губернскі

РЭПАЗІТОРЫЙ ВДПУ

ляснічы і 2 лясныя рэвізоры, а нагляд за лясніцтвамі быў даручаны 7 ляснічым. Такі парадак чыноў захаваўся нязменным да 1866 г. [16, арк 73-73 адв.; 17, арк. 218 адв.-219]. Акрамя таго, важнай задачай ляснога аддзялення быў падзел лясных дач на абыходы і аб'езды. Аднак гэты працэс быў сур'ёзна запаволены пастаянным змяненнем маёмаснага статусу лясоў, што прыводзіла да змянення колькасці лясных дач. Адчувальны поспех быў дасягнуты ў 1858 г., калі ўсе лясныя дачы Віцебскай губерні былі падзелены на 32 аб'езды і 283 абыходы, якія былі адзначаны дакладнымі межамі і ўрочышчамі. Пасля гэтага змены ў дадзеным кірунку арганізацыі лясоў не былі кардынальнымі [7, арк. 34].

Пільная ўвага звярталася на павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці кадраў. Так, у 1840-я гг. у сувязі з недахопам лясных чыноў, якія навучаліся ў Лясным і межавым інстытуце, у склад Корпуса ляснічых былі прызначаны адстаўныя ваенныя штаб-афіцэры і обер-афіцэры і грамадзянскія чыны, якія не атрымалі адпаведнай адукацыі. Разам з тым, некаторыя з чыноўнікаў не толькі не мелі неабходнай адукацыі, але і не ведалі ляснога заканадаўства і парадку справаводства. Палатам дзяржаўных маёмасцей было прадпісана пракантраляваць працэс павышэння кваліфікацыі такіх чыноўнікаў. Пры прадстаўленні чыноўніка да ўзнагароды неабходна было прыкладаць пасведчанне аб ступені валодання чыноўнікам сваёй справы [11, арк. 46-46 адв.]. Прадпісанне ад 19 чэрвеня 1861 г. сведчыць аб зацікаўленасці лесаахоўнай адміністрацыі ў павышэнні кваліфікацыі аб'ездчыкаў. Яно ўтрымлівала правілы аб допушчэнні іх да экзамену на званне кандуктара. Аб'ездчыкі, якія скончылі курс у адным з егерскіх вучылішч і знаходзіліся на службе, маглі хадайнічаць аб гэтым не раней, як праз 4 гады нясення службы [13, арк. 103–103 адв.]. Акрамя таго, у кантэксце кадравай палітыкі рэгламентаваліся парадак набыцця абмундзіравання, забеспячэнне чыноўнікаў грашовымі выплатамі, узнагародамі і жыллём [12, арк. 4-4 адв., 7 адв, 8 адв., 11 адв.; 13, арк. 6, 57, 65]. Палата таксама займалася адборам прыдатных для службы палясоўшчыкаў і размеркаваннем ляснічых па лясніцтвах губерні, а ў выпадку адсутнасці апошніх абавязкі ўскладаліся на кандуктараў ці памочнікаў акруговых начальнікаў [12, арк. 6–6 адв.; 18, арк. 9-11]. Трэба дадаць, што кіраўнікам палат было прадпісана штогадова да 1 студзеня і 1 чэрвеня дакладаць у Лясны дэпартамент пра маральныя і службовыя якасці афіцэраў, якія выпускаліся з Ляснога і межавага інстытута, а губернскім ляснічым пастаянна назіраць за службай і ладам жыцця маладых афіцэраў [12, арк. 7].

Віцебская палата дзяржаўных маёмасцей займалася і рэарганізацыяй ляснай варты. Да пачатку 1830-х гг. лясная варта складалася з аб'ездчыкаў, якія найманіся з сялян і адстаўных ваенных чыноў, палясоўшчыкаў і пажарных стараст, якія прызначаліся сельскімі абшчынамі. З мэтай паляпшэння якасці аховы лясоў ляснай вартай 28 снежня 1832 г. урадам было прынята рашэнне аб утварэнні пастаяннай ляснай варты. У яе прымаліся кандыдаты з сямейных дзяржаўных сялян ці сямейных адстаўных ваенных ніжэйшых чыноў. Тэрмін службы лясных аб'ездчыкаў і стралкоў пастаяннай ляснай варты складаў 20 гадоў, аднак па стане здароўя ці за неналежныя паводзіны яны маглі пакінуць пасаду датэрмінова. Сямействы пастаяннай ляснай варты вызваляліся ад плацяжу дзяржаўных падаткаў, выканання рэкруцкай і іншых павіннасцей, ад нагляду за лесам да ўладкавання ўласнай гаспадаркі, атрымлівалі права на безграшовы водпуск драўніны, неабходнай для пабытовых патрэб, продаж першапачатковага дома на сваю карысць, калі яго нельга было перавезці да месца службы, і адвядзенне паблізу ад дач зямельных надзелаў. Для агляду за сем'ямі пастаяннай ляснай варты і аб'ездчыкамі замацоўваліся абыходы і аб'езды. На пастаянную лясную варту ўскладаліся абавязкі па ахове лясоў ад самавольных высечак, пажараў, уліку высечанага лесу, збору насення, клеймаванні дрэў і г. д. [19]. Напачатку фарміраванне пастаяннай ляснай варты ў Віцебскай губерні праводзілася згодна з палажэннем ад 28 снежня 1832 г. і адпаведнымі цыркулярнымі прадпісаннямі ад 18 і 31 ліпеня 1839 г., 30 верасня 1842 г., 26 ліпеня 1843 г. [18, арк. 8–8 адв.]. Трэба адзначыць, што фарміраванне пастаяннай ляснай варты ішло вельмі маруднымі тэмпамі. Толькі ў 1848 г. справа ўстанаўлення пастаяннай ляснай варты зрушылася з кропкі. У Вязьменскай дачы Веліжскага павета быў засвед

чаны водпуск грошай на ўладкаванне для прынятых у варту сямействаў. У Цэрычскай дачы Суражскага павета сямействы былі абраны, зацверджаны і прадстаўлены да асігнавання ім грошай, але дазвол яшчэ не быў атрыманы. А ў Стоецкай дачы абранне сямействаў было прадстаўлена на разгляд губернатара [6, арк. 42–42 адв.]. Каб дасягнуць большай эфектыўнасці ў справе аховы лясоў на месцах, расійскім урадам было прынята рашэнне, працягваючы ўстанаўленне пастаяннай лясной варты, прызначыць адстаўных ніжэйшых чыноў і чыноў, што знаходзіліся ў бестэрміновым адпачынку і неслі службу не менш за 20 гадоў, у якасці ваенна-лясной варты. Кожнаму ваенна-лясному вартаўніку даручаўся абыход згодна з мерай абыходаў, прынятай для стралкоў пастаяннай лясной варты. У межах даручаных абыходаў узводзіліся жылыя дамы для двух вартаўнікоў сумежных участкаў лесу альбо для кожнага вартаўніка асобныя ў выпадку неабходнасці. Яны, як і пастаянная лясная варта, атрымлівалі зямельныя надзелы, але меншай плошчы. У астатнім іх забеспячэнне супадала з забеспячэннем пастаяннай лясной варты. Па сутнасці, вартаўнікі і стралкі мелі аднолькавыя абавязкі, падначаленасць і адказнасць [18, арк. 23–27].

Трэба адзначыць, што Міністэрства дзяржаўных маёмасцей не здолела своечасова ўстанавіць неабходную колькасць сямействаў пастаяннай лясной варты і ваенна-лясных стралкоў у беларускіх губернях, што прывяло да выдання шэрагу прадпісанняў і загадаў для выпраўлення сітуацыі [11, арк. 218-219; 12, арк. 11 адв.; 18, арк. 62]. Нягледзячы на гэтыя спробы, рэфармаванне лясной варты і, у прыватнасці, прызначэнне ваенна-лясных вартаўнікоў ішло вельмі павольна. Мясцовая адміністрацыя тлумачыла гэта недахопам жадаючых паступіць у варту, і абмежаванасцю прызначанага ёй забеспячэння. Цэнтральныя органы кіравання бачылі праблему ў дрэнным інфармаванні кандыдатаў аб прывілеях [20, арк. 15–20, 22-23 адв., 27–29 адв.]. Кадравая сітуацыя абвастралася ў сувязі з прызывам на абавязковую службу бестэрмінова-адпускных чыноў у 1848 г. і 1859 г. у сувязі з правядзеннем мабілізацыйных мерапрыемстваў, якія былі выкліканы рэвалюцыйнымі падзеямі ў Францыі і, магчыма, Аўстра-Італа-Французскай вайной [12, арк. 9 адв.; 18, арк. 66]. У першай палове 1850-х гг. была здзейснена спроба ўмацавання лясной варты стралкамі стралковых батальёнаў, якія праслужылі 15 гадоў, з тым, каб даслужыць там тэрмін, прадугледжаны законам. Галоўныя іх абавязкі заключаліся ў ахове казённых лясоў ад незаконных высечак і пажараў [18, арк. 139; 21]. Аднак правядзенне і гэтай кампаніі было часткова парушана ў сувязі з Крымскай вайной, якая пачалася ў кастрычніку 1853 г. [18, арк. 170–170 ад.]. Рэфармаванне лясной варты было запавольнена парушэннямі, на якія ўказвалі ў сваіх гадавых справаздачах віцэінспектары Корпуса ляснічых: зімой дамы былі халодныя, дахі пускалі цечу, некаторыя дамы ўвогуле патрабавалася перабудаваць нанова, а некаторыя сем'і вартаўнікоў жылі ў беднасці з-за недахопу вылучаных зямель. У сувязі з гэтым віцэінспектары Корпуса пры аглядах былі ўпаўнаважаны рабіць распараджэнні аб ліквідацыі недахопаў і запазычваць у палатах дзяржаўных маёмасцей суму да 500 руб. з наступным кампенсаваннем гэтай сумы вінаватымі [18, арк. 171–172 ад.]. Трэба адзначыць, што 8 ліпеня 1859 г. Віцебская палата дзяржаўных маёмасцей накіравала ў Лясны дэпартамент меркаванне аб тым, што ваенна-лясная варта была прызнана неэфектыўнай, і прапанавала замяніць яе пастаяннай лясной вартай [22, арк. 102]. Так, з цягам часу акцэнт у працэсе рэфармавання лясной варты ў Віцебскай губерні перамясціўся на ўсталяванне пастаяннай лясной варты.

Увага надавалася і вядзенню следстваў. На падставе вывучэння адпаведных ведамасцей можна вывесці агульную тэндэнцыю да запаволенага руху спраў аб парушэннях ляснога заканадаўства, у прыватнасці аб высечках. Гэтае пытанне палата закранула яшчэ ў 1846 г., калі губернскі ляснічы паведаміў аб запавольненым руху спраў, звязаных з лесавынішчэннямі. Віну за гэта ён усклаў на нераспарадлівасць земскай паліцыі [16, арк. 77-82]. У сувязі з працягам павольнага вядзення следчых спраў аб вынішчэннях лясоў 28 чэрвеня 1858 г. было прадпісана да 15 верасня 1858 г. данесці ў Лясны дэпартамент аб прычынах павольнага вядзення спраў. Палата павінна была паведаміць аб колькасці самавольных высечак і пакаранні вінаватых [12, арк. 3 адв.]. З мэтай аптымізацыі правядзення следстваў

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

18 лютага 1861 г. Лясны дэпартамент прапанаваў палаце не знішчаць білеты і загады на высечку лесу і ў выпадку, калі яна ўзбуджала падазрэнне ў незаконнасці, прыкладаць арыгіналы гэтых дакументаў да следчай справы [13, арк. 97 адв.]. У прадпісаннях удакладнялася і сістэма выяўлення вінаватых ў парушэнні ляснога заканадаўства. Калі супраць абвінавачанага ў якім-небудзь злачынстве не было поўнай базы доказаў, то ён пакідаўся пад падазрэннем, што, у сваю чаргу, азначала не адсутнасць віны, а толькі адсутнасць дасканалага доказу. Паказанні лясной варты пры парадку, які існаваў, не прымаліся за пераканаўчы доказ, у той час як нярэдка вартаўнікі станавіліся адзінымі сведкамі злачынства. Пры дачы заключэнняў на прыгаворы па справах аб вынішчэнні лясоў Лясны дэпартамент заклікаў палаты дзяржаўных маёмасцей з асаблівай асцярожнасцю рабіць высновы наконт ступені віны лясной варты ў недаглядзе за даручаным ёй лесам. У выпадку, калі нават вінаватыя былі выяўлены лясной вартай, але судом пакідаліся ў якасці падазроных, з варты спаганяліся грошы за прычыненыя страты [13, арк. 96–96 адв.]. Толькі з канца 1861 г. пачалося рэальнае абмеркаванне пытання аб прыданні статусу доказаў паказанням пастаяннай лясной варты. Калі пры разглядзе спраў аб самавольных высечках было выяўлена, што злоўжыванне было выкрыта без удзелу варты ці не было ёй своечасова спынена, то яна прызнавалася вінаватай у слабым наглядзе за даручаным лесам. Акрамя таго, значная ўвага звярталася на своечасовасць правядзення следства і высвятленне абставін справы, згодна з якімі можна было б ускласці адказнасць за парушэнні на ляснічага ці следчых. Гэтыя ж правілы былі актуальны і пры разглядзе спраў аб лясных пажарах [13, арк. 161–162].

Для больш аб'ектыўнай ацэнкі дзейнасці палаты дзяржаўных маёмасцей па ахове лясоў у Віцебскай губерні асаблівага аналізу патрабуюць статыстычныя даныя. Папершае, варта звярнуць увагу на змяненне плошчы лясоў, якія знаходзіліся пад наглядам Віцебскай палаты дзяржаўных маёмасцей. Аналізуючы інфармацыю справаздач, можна вывесці агульную тэндэнцыю да значнага павелічэння плошчы адзначаных лясоў (з 264 300 дзес. у 1844 г. да 381 710 дзес. у 1866 г.). У большай ступені прырост лясных тэрыторый адбываўся ў выніку змянення іх маёмаснага статусу. З цягам часу ўсё большая колькасць лясоў, якія знаходзіліся пад наглядам палаты, канцэнтравалася ў адзінай уласнасці казны (з 7512 дзес. у 1844 г. да 344 374 дзес. у 1866 г.). Гэта дазваляла кансалідаваць намаганні па арганізацыі аховы дадзеных лясоў [8, арк. 598–599; 17, арк. 214 адв.-217]. Па-другое, адзначаны перыяд характарызуецца якаснымі зменамі ў складзе лясной варты, якая непасрэдна прымала ўдзел у ахове лясоў ад вынішчэння. Так, пры аналізе штогадовых справаздач была выяўлена адваротна прапарцыянальная залежнасць велічынь сукупнай колькасці палясоўшчыкаў, якая памяншалася, і сукупнай колькасці сем'яў пастаяннай лясной варты, стралкоў стралковых батальёнаў, ваенна-лясных вартаўнікоў, якая павялічвалася [8, арк. 153, 370, 417; 17, арк. 218 адв.-219]. Адзначанае сведчыць, што лясная варта паступова набывала стабільны, пастаянны і ўстойлівы характар. Гэта дазваляла паменшыць колькасць выпадкаў прызначэння ў лясную варту непрыдатных сялян і разлічваць на большую эфектыўнасць лесаахоўных мерапрыемстваў, нягледзячы на даволі павольны тэмп рэфармавання. Патрэцяе, важным паказальнікам эфектыўнасці дзейнасці Віцебскай палаты дзяржаўных маёмасцей з'яўляюцца даныя аб колькасці выпадкаў вынішчэння лясоў. Згодна з адпаведнымі статыстычнымі звесткамі, найбольш значная шкода казённым лясам Віцебскай губерні была нанесена менавіта самавольнымі высечкамі. Выводзячы агульную тэндэнцыю, можна заўважыць хвалепадобны нязначны рост грашовых сум, якія з'яўляліся эквівалентам шкоды лясам, у сярэдзіне-канцы 1840-х гг., працяг іх нарастання да канца 1850-х гг. з выбухам у 1859 г. (адзін з найбольшых паказчыкаў – 6036 руб.) і паступовым хвалепадобным спадам да сярэдняй адзнакі ў 1337 руб. да сярэдзіны 1860-х гг. (выключэнне – рост сумы у 1866 г. да 5294 руб.). Адпаведную тэндэнцыю можна назіраць і пры разглядзе звестак пра колькасць высечак [6, арк. 69-70; 7, арк. 49-49 адв.; 8, арк. 602; 15, арк. 72-73; 17, арк. 206-207; 22, арк. 117-118; 23, арк. 78-79; 24, арк. 285-286 адв.]. Разам з тым, трэба мець на ўвазе той факт, што 22 сакавіка 1861 г. было прынята рашэнне пры спагнаннях за самавольныя высечкі, пры ацэнцы кожнага дрэва

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вызначаць колькасць і памеры ўсіх сартыментаў, якія магчыма было нарыхтаваць з высечанага дрэва, а не абмяжоўвацца ацэнкай толькі тых матэрыялаў, якія сапраўды былі нарыхтаваны і вывезены з дачы [12, арк. 38 адв.]. У той жа час рост колькасці высечак, акрамя іншага, трэба звязваць з павелічэннем колькасці лясных тэрыторый, якія ў адзначаны перыяд апынуліся пад наглядам Віцебскай лесаахоўнай адміністрацыі.

Такім чынам, дзякуючы дзейнасці Віцебскай палаты дзяржаўных маёмасцей у 1840–1866 г., цалкам ці часткова былі ажыццёўлены захады адпаведнага міністэрства па пераўпарадкаванні лясных плошчаў у зручныя для нагляду тэрыторыі, забеспячэнні іхляснымі чынамі, рэфармаванні лясной варты і ўдасканаленні мясцовай лесаахоўнай дзейнасці. Гэта прывяло да таго, што мясцовая лесаахоўная адміністрацыя Віцебскай губерні набывала больш цэнтралізаваны характар, што садзейнічала павышэнню эфектыўнасці аховы лясоў.

*Літаратура*


1. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – ПСЗРИ. – 2е собр. – Т. 12. – Отд. 1. – № 10834. – С. 1039–1053.
2. ПСЗРИ. – 2е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 11978. – С. 111–119.
3. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 18. – Отд. 1. – № 16461. – С. 32–35.
4. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 13. – Отд. 1. – № 11189. – С. 405–654.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ). НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 24.
6. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 753.
7. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1771.
8. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 361.
9. ПСЗРИ. – 2е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 13035. – С. 989–1150.
10. ПСЗРИ. – 2е собр. – Т. 20. – Отд. 1. – № 18882. – С. 305–306.
11. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 221.
12. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1348.
13. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1895.
14. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 14. – Отд. 2. – Штаты и табели. – 310 с.
15. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 477.
16. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 561.
17. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 2340.
18. НГАБ. – Ф. 27. Воп. 1. Спр. 44.
19. ПСЗРИ. – 2е собр. – Т. 7. – Отд. 1. – № 5869. – С. 943–956.
20. НГАБ. Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 479.
21. Положение о комплектовании стрелковых батальонов кантонистами лесной стражи и о комплектовании сей последней нижними чинами стрелковых батальонов. – СПб. : Военная типография, 1851. – 36 с.
22. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1778.
23. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 670
24. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 2101.


*References*


1. Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii (daley – PSZRI). – PSZRI. – 2 ye sobr. – T. 12. – Otd. 1. – № 10834. – S. 1039–1053.
2. PSZRI. – 2 ye sobr. – T. 14. – Otd. 1. – № 11978. – S. 111–119.
3. PSZRI. – 2-ye sobr. – T. 18. – Otd. 1. – № 16461. – S. 32–35.
4. PSZRI. – 2-ye sobr. – T. 13. – Otd. 1. – № 11189. – S. 405–654.
5. Natsyyanalny gistarychny arkhiu Belarusi u g. Minsku (daley – NGAB). NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 24.
6. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 753.
7. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1771.
8. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 361.
9. PSZRI. – 2 ye sobr. – T. 14. – Otd. 1. – № 13035. – S. 989–1150.
10. PSZRI. – 2 ye sobr. – T. 20. – Otd. 1. – № 18882. – S. 305–306.
11. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 221.
12. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1348.
13. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1895.
14. PSZRI. – 2-ye sobr. – T. 14. – Otd. 2. – Shtaty i tabeli. – 310 s.
15. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 477.
16. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 561.
17. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 2340.
18. NGAB. – F. 27. Vop. 1. Spr. 44.
19. PSZRI. – 2 ye sobr. – T. 7. – Otd. 1. – № 5869. – S. 943–956.
20. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 479.
21. Polozheniye o komplektovanii strelkovykh batalyonov kantonistami lesnoy strazhi i o komplektovanii sey posledney nizhnimi chinami strelkovykh batalyonov. – SPb. : Voyennaya tipografiya, 1851. – 36 s.
22. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1778.
23. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 670
24. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 2101.


РЭПАЗІТОРЫЙ ВДПУ